Я. Р. РАДКЕВІЧ

# БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ Ў ГАДЫ БАРАЦЬБЫ ЗА ВЫЗВАЛЕННЕ БЕЛАРУСІ

Яшчэ восенню 1941 года ЦК КП(б)Б заняўся арганізацыяй радыёвяшчання з Масквы на акупіраваную фашыстамі Беларусь. Падбіраліся журналісцкія кадры, планавалася работа рэдакцыйнага калектыву. Беларуская рэдакцыя пачала працаваць у складзе Усесаюзнага радыёкамітэта разам з украінскай, малдаўскай, літоўскай, латышскай і эстонскай.

1 студзеня 1942 года пачала працаваць на хвалі 48,15 метраў радыёстанцыя «Савецкая Беларусь». Напачатку памер вяшчання радыёстанцыі складаў 2,5 гадзіны ў суткі, перадачы выходзілі тройчы: у 9.00, 14.30 і 20.00 гадзін. Праз некаторы час колькасць выхадаў павялічылася да пяці разоў, а памер вяшчання вырас да 7 гадзін.

На пасаду адказнага рэдактара быў прызначаны С. К. Майхровіч, вядомы беларускі публіцыст. Яго намеснікам стаў драматург, аўтар першай беларускай радыёп'есы В. П. Палескі-Станкевіч. У склад рэдакцыі ўвайшлі таксама Ф. В. Руцкі, К. Л. Губарэвіч, М. А. Машара, А. В. Бярозкін, М. В. Рымар, А. С. Рокаш, пісьменнікі і журналісты, якія добра зарэкамендавалі сябе ў даваенны час. Усе яны выступалі перад мікрафонам, выязджалі на фронт і за лінію фронта, расказваючы затым пра гэтыя паездкі ў нарысах, карэспандэнцыях, публіцыстычных выступленнях. Атмасферу першых месяцаў работы радыёстанцыі «Савецкая Беларусь» уваскрашаюць успаміны яе былога дыктара, затым вядомага публіцыста і пісьменніка У. М. Юрэвіча, які разам з Л. Я. Бацвінік вёў перадачы Беларускага радыё яшчэ ў даваенны час: «Сабраліся людзі, якія перажылі горыч адступлення з палаючых сёл і гарадоў Беларусі, развітанне з роднымі і блізкімі, перанеслі першыя бамбёжкі і абстрэлы, паспытаўшы смак чорнага салдацкага сухара ці сціплага працоўнага пайка ў тыле. Мы жылі тымі ж клопатамі, якімі ў той цяжкі для Радзімы час жыў кожны савецкі патрыёт. «Усё для фронта, усё для перамогі!» — такі быў дэвіз усіх працаўнікоў у савецкім тыле. Пад гэтым дэвізам праходзіў і наш творчы, запоўнены з раніцы да позняй ночы дзень, асноўнай задачай якога было данесці праз вогненны небасхіл у тыл ворага, для партызан і тых, каму ўдавалася пад пагрозай смерці карыстацца пад носам у гітлераўцаў радыёпрыёмнікам, сапраўдную праўду пра вайну»[1].

Работай рэдакцыі кіраваў непасрэдна ЦК КП(б)Б. Расклад перадач радыёстанцыі «Савецкая Беларусь» быў вядомы ўсім падпольным камітэтам партыі і партызанскім злучэнням. ЦК зацвярджаў тэматычныя планы рэдакцыі і накіроўваў яе дзейнасць з улікам абстаноўкі і ў адпаведнасці з тымі задачамі, якія выраршаліся партыяй. У газеце «Савецкая Беларусь» рэгулярна друкаваліся паведамленні аб рабоце радыёстанцыі.

У верасні 1942 года справаздача рэдакцыі абмяркоўвалася на бюро ЦК КП(б)Б, дзе падводзіліся вынікі вялікай работы. За восем месяцаў было падрыхтавана больш як 800 перадач, у тым ліку звыш 700 прапагандысцкіх артыкулаў і гутарак, каля 3000 інфармацыйных паведамленняў, карэспандэнцый, выступленняў грамадскіх дзеячоў, пісьменнікаў, партызан і падпольшчыкаў.

Перад рэдакцыяй былі пастаўлены канкрэтныя задачы па паляпшэнню перадач, каб яшчэ шырэй асвятляць гераічную барацьбу беларускага народа супраць нямецкіх акупантаў [2].

Адначасова з арганізацыяй вяшчання з Масквы ЦК КП(б)Б наладжваў забеспячэнне партызанскіх атрадаў і падпольных груп апаратурай, якая дазваляла б не толькі прымаць перадачы з Цэнтра, але і перадаваць туды важныя аператыўныя звесткі. Ужо ў жніўні 1942 года ўсім удзельнікам нарады камандзіраў буйнейшых партызанскіх злучэнняў, якая праводзілася ў Маскве, былі перададзены партатыўныя радыёстанцыі. Кожную з іх абслугоўваў спецыяльна падрыхтаваны радыст. Гэта дазволіла да чэрвеня 1942 года наладзіць работу 101 партызанскай радыёстанцыі. Партызаны і падпольшчыкі мелі сотні прыёмнікаў, па якіх рэгулярна слухалі Маскву.

У першым выпуску радыёстанцыя «Савецкая Беларусь» перадала зводкі Савецкага Інфармбюро аб паражэнні гітлераўскіх войск пад Масквой. Да шматпакутных землякоў-беларусаў звярнуўся народны паэт рэспублікі Я. Купала. «Кліч да беларускага народа» — так называлася яго

выступленне, у якім ён гаварыў пра святы абавязак змагацца «за радасць нашага жыцця, за мілую нашу зямлю, за яе волю і шчасце».

Інфармаванне насельніцтва аб становішчы на франтах Вялікай Айчыннай вайны, аб рабоце савецкага тылу, аб баявых дзеяннях партызан і падпольшчыкаў ператваралася ў важную палітычную акцыю. Зводкі Саўінфармбюро займалі цэнтральнае месца ў выпусках навін. Акрамя таго, свежыя звесткі паступалі з Беларускага штаба партызанскага руху, з якім рэдакцыя падтрымлівала цесную сувязь. Не было ніводнай больш-менш значнай падзеі часоў Вялікай Айчыннай вайны, пра якую не паведаміла б радыёстанцыя «Савецкая Беларусь». Разам з франтавой і партызанскай хронікай перадаваліся падборкі інфармацый пад рубрыкамі «Весткі з Савецкай Радзімы», «Па Савецкаму Саюзу», «Паведамленні з-за граніцы», «З усяго свету». Дзве апошнія рубрыкі таксама былі прысвечаны паведамленням ваеннага характару, мэта іх была паказаць народным мсціўцам і насельніцтву Беларусі, што вайна супраць фашызму шырыцца: змагаюцца патрыёты Югаславіі, Польшчы, Францыі, вядуцца баявыя дзеянні ў Афрыцы, на Ціхім і Атлантычным акіянах. Кожны дзень для партызанскіх агітатараў перадаваліся агляды друку, для рэдакцый падпольных газет радыёстанцыя спецыяльна рыхтавала прапагандысцкія і інфармацыйныя матэрыялы і перадавала ў такім тэмпе, каб можна было іх запісаць. Гэтак жа дыктаваліся важныя партыйныя дакументы: заклікі ЦК ВКП(б) і ЦК КП(б)Б, загады Вярхоўнага Галоўнакамандавання.

У дні вайны інфармацыйная служба радыё набыла адну знамянальную адметнасць: замест спакойных, размераных па тэмпу паведамленняў, якія перадаваліся ў мірныя дні, пачалі гучаць напоўненыя гневам і ненавісцю да ворага ці гордасцю за гераізм савецкіх людзей палымяныя зводкі з франтоў, у якіх чулася гарачае дыханне смяротных баёў. Звернем увагу на тое, як звычайна адкрывала свае перадачы радыёстанцыя «Савецкая Беларусь»: «Увага! Гаворыць радыёстанцыя «Савецкая Беларусь». Слухай нас, родны беларускі народ! Слухай нас, родная беларуская зямля!» Ужо ў гэтым звароце трапятала хваляванне разлучаных вайною і жорсткімі нягодамі людзей; метафара народнага сказу, абагулены паэтычны вобраз яскрава праглядаўся ў экспрэсіўных фразах. Паведамленні пра баявыя дзеянні байцоў Чырвонай Арміі і партызан суправаджаліся заклікамі: «Смерць нямецкім акупантам!», «Узнімем яшчэ вышэй сцяг партызанскай барацьбы!», «Ніякай літасці здраднікам!» і г. д.

Для больш яснага разумення характару радыёвяшчання ваенных год трэба адзначыць наступны фактар: агульнай рысай радыёперадач таго часу з'яўлялася палымяная публіцыстычнасць. Які б жанр мы не ўзялі: інфармацыйную заметку, гутарку, радыёнарыс, фельетон — усюды прысутнічала вострая надзённасць, дакладная грамадска-палітычная скіраванасць, эмацыянальная насычанасць, выказаная пэўнымі стылёвымі і моўнымі сродкамі. Нездарма ж у 1943 годзе К. Чорны сцвярджаў у адной з гутарак, напісанай ім для радыёстанцыі «Савецкая Беларусь»: «У час Вялікай Айчыннай вайны публіцыстыка стала нашым асабліва папулярным жанрам. Гэта бадай што самы рухавы і аператыўны від моўнай творчасці. Тут непасрэдна слова гучыць больш востра. Публіцыстыка стала выдатнай зброяй нашага змагання»[3].

Значнай падзеяй у палітычным жыцці таго часу стаў радыёмітынг прадстаўнікоў беларускага народа, які трансліраваўся па радыёстанцыі «Савецкая Беларусь» 18 студзеня 1942 года. На ім выступалі партызаны, што прыбылі з-за лініі фронту, байцы Чырвонай Арміі, дзяржаўныя дзеячы БССР, рабочыя беларускіх прадпрыемстваў, вучоныя, пісьменнікі. Удзельнікі мітынгу звярнуліся да свайго народа з заклікам бязлітасна змагацца супраць фашысцкіх захопнікаў. Тут разам з С. Прытыцкім, М. Зімяніным, Я. Купалам, М. Танкам выступаў і К. Чорны. Ён сказаў: «Я бачыў, як трашчалі ў агні беларускія кнігасховішчы, як гінула гордасць нашай рэспублікі і гордасць Савецкага Саюза — Ленінская бібліятэка ў Мінску. Я бачыў, як гарэла і гінула ў агні беларуская кніга, як падала ў руіны сталіца нашай рэспублікі — Мінск, як гінулі Гомель і Віцебск і іншыя нашы гарады. Але разам з тым, перад усім светам, збіраўся на вялікае змаганне наш народ, вечна непакорны перад ворагам»[4].

Прызнаныя майстры слова — беларускія пісьменнікі шмат зрабілі, каб надаць перадачам радыёстанцыі баявы дух высокай публіцыстыкі. Амаль кожны дзень гучалі ў эфіры шырока вядомыя сярод партызан гнеўныя

радкі Я. Купалы: «Партызаны, партызаны, беларускія сыны! За няволю, за кайданы рэжце гітлерцаў паганых, каб не ўскрэслі век яны!»

Адным з самых яркіх і запамінальных, надзвычайным па сваіх шчырых чалавечых пачуццях было выступленне па радыё Я. Коласа з чытаннем пісьма да сына Юрыя, з якім перапынілася сувязь у пачатку вайны. Перад слухачамі ў асобе Я. Коласа ўзнікаў не толькі вобраз народнага паэта, дзяржаўнага дзеяча, але і бацькі, які балюча пакутуе ад страты блізкага чалавека.

У лютым 1943 года Я. Колас сустрэўся ў радыёстудыі з героем сваёй аповесці «Дрыгва», вядомым беларускім партызанам дзедам Талашом, якога пераправілі на Вялікую зямлю для ўручэння баявой ўзнагароды. Перадача аб гэтай сустрэчы, як і выступленні дзеда Талаша, былі ўспрыняты слухачамі вельмі прыхільна.

Частымі гасцямі радыёстанцыі былі і паэты П. Броўка, М. Танк, А. Астрэйка, А. Куляшоў, П. Панчанка, А. Бялевіч і іншыя. Часам яны выкарыстоўвалі своеасаблівыя гутаркі-кампазіцыі, калі публіцыстычнае выступленне натуральна пераходзіла ў верш. Гэтая вельмі эмацыянальная, трыбунная форма выступлення перад мікрафонам дазваляла з найбольшай глыбінёй, уздымам і хвалюючай пафаснасцю выказваць свае думкі і адчуванні.

Супрацоўнікі радыёстанцыі выкарыстоўвалі любую магчымасць, каб запрасіць да мікрафона вядомых майстроў беларускага мастацтва, наладжвалі спецыяльныя музычныя і літаратурныя радыёвечары. Больш за 50 канцэртаў далі па радыё народная артыстка СССР Л. П. Александроўская, народныя артысты БССР Р. В. Млодэк, Д. А. Арлоў, А. К. Ільінскі, П. С. Малчанаў, заслужаныя артысты БССР Л. Ф. Аляксеева, І. А. Мурамцаў, І. М. Балоцін, Беларускі ансамбль песні і танца, Беларускі франтавы тэатр і іншыя.

Жывую сувязь са слухачамі рэдакцыя падтрымлівала праз пісьмы, якія ішлі ў яе адрас з чырвонаармейскіх часцей, з савецкага тылу, з-за лініі фронта. Па прыкладу Усесаюзнага радыё, якое арганізавала штодзённыя перадачы «Пісьмы на фронт» і «Пісьмы з франтоў Вялікай Айчыннай вайны», радыёстанцыя шырока выкарыстоўвала ў сваіх перадачах карэспандэнцыю радыёслухачоў. «Пісьмы з партызанскага краю» і «Пісьмы з фашысцкай няволі» — так называліся дзве вельмі важныя рубрыкі радыёстанцыі «Савецкая Беларусь».

20 верасня 1944 года радыёстанцыя «Савецкая Беларусь» перадала сваю апошнюю перадачу — 3270-ю. Кожная з іх унесла пэўны ўклад у разгром ворага, у вызваленне роднай Беларусі.

[1] Радио в дни войны.— М., 1975, с. 61.
[2] Партархіў Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ, ф. 4, воп. 3, спр. 1236, арк. 184.
[3] ЦДАКР і СБ БССР, ф. 871, в. 1, адз. зах. 10, арк. 11—15.
[4] Чорны К. Збор твораў — Мінск, 1975, т. 8, с. 320—321.